# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ ГУЛЬНІ НА ЎРОКАХ МУЗЫКІ

У малодшым школьным узросце любімым заняткам дзяцей застаецца гульня. Паводле назіранняў псіхолагаў, дзіцячая гульня і мастацкая дзейнасць, разнавіднасцю якой з'яўляецца ўспрыманне музыкі, маюць шмат агульнага. Выкарыстанне гульнёвых сітуацый на ўроку актывізуе мастацкую фантазію вучняў, узбагачае іх эмацыянальна-вобразную сферу. Уцягваючы дзяцей у гульню, робячы іх саўдзельнікамі мастацкіх падзей, мы дапамагаем ім авалодаць навыкамі музіцыравання, засвоіць элементы музычнай мовы.

Спынімся больш падрабязна на аналізе некаторых гульнёвых сітуацый, апрабаваных намі ў практычнай рабоце з вучнямі.

### „БУЛЬБА“

#### (Беларускі народны танец)

— Пасадзіў дзед бульбу,— гаворыць настаўнік,— і яна добра ўрадзіла. Сабраўшы ўраджай, ён так узрадаваўся, што ногі самі пайшлі ў скокі.

Гучыць музыка. Як бы мог скакаць пад яе дзед? (Прапануем гэта паказаць аднаму з вучняў.) Затым пачала скакаць баба, а за ёю ўнукі.

— Але свята на гэтым не канчаецца,— працягвае настаўнік. — Пачулі музыку суседзі і прыйшлі са сваімі музычнымі інструментамі. Адзін з іх пачаў іграць на бубне, другі — на трашчотцы, нехта зайграў на барабане, а хтосьці падыграў на трохвугольніку. Так непрыкметна і стварыўся аркестр.

Цяпер твор гучыць ад пачатку да канца. Дзеці танцуюць, музыканты акампаніруюць, а астатнія дзеці выконваюць рух “Спружынка" з паваротамі, лёгка пагойдваючыся на абедзвюх нагах, не адрываючы ступні ад падлогі. Рукі ў хлопчыкаў на поясе, дзяўчынкі трымаюць уяўную хустачку.

Пасля выканання танца гутарым з дзецьмі. Чаму так лёгка было ўсім танцаваць пад гэту музыку, так проста і нязмушана падыгрываць на музычных інструментах? Ды, напэўна, таму, што гучала народная музыка, а яе выкананне даступна ўсім людзям — і дарослым, і дзецям. У ёй перададзены вясёлы і радасны настрой.

Так дасягаецца мэта ўрока — развіццё ў дзяцей цікавасці да народнай музыкі. Такая пастаноўка пытання прынцыпова адрозніваецца ад вельмі распаўсюджанай у практыцы, калі мэта прымітыўна выводзіцца з назваў музычных твораў. Вучым песню пра школу — значыць, выхоўваем любоў і цікавасць да школы, песню пра маму — вучым любіць і паважаць маму і г. д. Нагадаем, што мэты музычна-эстэтычнага выхавання ў агульнаадукацыйнай школе — фарміраванне цікавасці да музыкі, развіццё розных граней эстэтычнай свядомасці школьнікаў (эстэтычных пачуццяў, ацэнак, патрэб, густаў, ідэалаў), актывізацыя музычнага ўспрымання. Гэта ўрокі мастацтва, і дасягненне выхаваўчай мэты з'яўляецца адным з прынцыповых аспектаў творчай дзейнасці настаўніка, яе выніковасці.

### „ПОЛЬКА“ М. І. ГЛІНКІ

— Міхаіл Іванавіч Глінка — вялікі рускі кампазітар, які жыў у мінулым стагоддзі, — пачынае настаўнік. — Ён складаў музыку як для дарослых, так і для дзяцей. Полька, якую мы будзем слухаць,

напісана ім спецыяльна для маленькай пляменніцы Волечкі. Гэта хуткі і вясёлы танец. Паслухаем музыку і паспрабуем вызначыць тыя месцы, якія зручна адзначаць воплескамі.

Настаўнік дапамагае вучням знайсці гэтыя месцы. У першых 8 тактах п'есы кожны воплеск трапляе на канчатак фраз, у 9 — 16-м тактах — на кожную пульсуючую долю.

Затым настаўнік запрашае да дошкі чацвярых вучняў і прапануе па ланцужку паўтарыць заданне, але ўжо з дапамогай дзіцячых музычных інструментаў. Выконваецца музыка першых 8 тактаў. Уступленне інструментаў размяркоўваецца ў такім парадку: бубен, трохвугольнік, металафон (выконваецца глісанда) і мяккая гумавая цацка з "пішчалкай". Такая "інструментоўка" ўносіць неабходны кантраст у выкананне, пэўнае "ўшчыльненне" тэмбру і нават элемент жарту.

Адна з умоў гульні — вучань, які памыліўся (раней ці пазней уступіў у ігру аркестра), выбывае з гульні, а яго месца ў аркестры займае той вучань, які заўважыў памылку. Другую частку п'есы (9 — 16-ы такты) выконвае ўвесь клас воплескамі на кожную долю (пульс), а дзеці ля дошкі іграюць тое самае на сваіх інструментах.

жыў нядоўга, але паспеў напісаць шмат цудоўных твораў. Яго музыка вылучаецца жыццярадаснасцю, лёгкасцю гучання, рухомасцю. Яна лёгка пазнаецца і запамінаецца.

Сёння мы праслухаем адзін з найбольш вядомых і папулярных твораў кампазітара — "Ронда ў турэцкім стылі" (яго называюць яшчэ "Турэцкі марш"). У той час у Еўропе з'явіўся новы музычны інструмент — турэцкі барабан, які пачалі выкарыстоўваць у аркестрах. Гэта падзея і выклікала ў Моцарта жаданне напісаць свой твор. Асабліва прыгожа гучыць першая частка, мелодыя якой пастаянна паўтараецца, чаргуючыся з іншымі мелодыямі нібыта па кругу. Невыпадкова твор і быў названы кампазітарам "Ронда". Слова **ронда** азначае круг, рух па кругу. Калі абазначыць літарай **А** першую мелодыю, то чаргованне мелодый у "Ронда" будзе выглядаць так:

**А — Б — А — В — А**

Як бачыце, першая мелодыя **А** (яе называюць рэфрэнам) пастаянна паўтараецца, а іншыя мелодыі (іх называюць эпізодамі) чаргуюцца. Паслухаем, як кампазітару ўдалося так пабудаваць свой твор. Гучанне рэфрэна будзем адзначаць з дапамогай маленькага званочка.




Такі метадычны падыход дазваляе арганізаваць прадукцыйную творчую дзейнасць вучняў, у працэсе якой і адбываецца засваенне зместу гэтага невялікага, але вельмі прывабнага музычнага твора.

"Полька" з гэтага часу будзе карыстацца вялікай папулярнасцю ў дзяцей, надоўга застанецца ў іх памяці. Выхаваўчая мэта тут можа быць вызначана як фарміраванне цікавасці да класічнай музыкі.

## „РОНДА Ў ТУРЭЦКІМ СТЫЛІ" МОЦАРТА

— Вольфганг Амадэй Моцарт — выдатны аўстрыйскі кампазітар. Жыў ён больш за дзвесце гадоў таму назад. Ужо ў дзіцячыя гады ў яго выявіліся незвычайныя музычныя здольнасці. Ён іграў на розных музычных інструментах, сам ствараў музыку. Разам з бацькам і старэйшай сястрой маленькі хлопчык выступаў з канцэртамі ў многіх гарадах Еўропы і заўсёды выклікаў захапленне слухачоў. Моцарт пра-

У самым канцы твора, у яго фінале, мэтазгодна выкарыстаць прыёмы пластычнага інтанавання і свабоднага дырыжыравання, у прыватнасці хістанне паднятых над галавой рук. Такія рухі дапамагаюць падкрэсліць, што ў творы перададзены не проста вясёлыя, радасныя пачуцці, а трыумфальны настрой, якім прасякнута музыка Моцарта.

Так дзеці знаёмяцца з элементамі музычнай формы ронда.

І гэтага зусім дастаткова на дадзеным этапе работы. З больш дэталёвым аналізам творчасці Моцарта вучні сустрэнуцца ў старшых класах. Зараз жа важна выклікаць у іх цікавасць да музыкі гэтага кампазітара, эмацыянальны водгук на яе, актывізаваць успрыманне, што ўжо само па сабе з'яўляецца важнай выхаваўчай задачай.

**В. П. РЭВА,**
**кандыдат педагагічных навук.**
г. Магілёў.